

# Зярнятка 15

*Сярод вас стаіць той, каго вы не ведаеце* — Ян 1, 6–8. 19–28

**17 снежня 2017 г., III нядзеля Адвэнту, год В**



З’явіўся чалавек, пасланы ад Бога; імя ягонае было Ян. Ён прыйшоў дзеля сведчання, каб сведчыць пра Святло, каб усе паверылі праз яго. Не быў ён святлом, але быў пасланы, каб сведчыць пра Святло.

І вось сведчанне Яна. Калі юдэі паслалі з Ерузалема святароў і левітаў, каб яны спыталіся ў яго: Хто ты? Ён абвясціў, і не выракся, і вызнаў: Я не Хрыстус.

І спыталіся ў яго: Дык хто ж? Ты Ілля?

І сказаў: Не.

Ты прарок?

І ён адказаў: Не.

Тады сказалі яму: Хто ж ты, каб нам адказаць тым, хто паслаў нас. Што гаворыш ты пра самога сябе?

Ён сказаў: Я голас таго, хто кліча ў пустыні: раўняйце дарогу Пану, як сказаў прарок Ісая.

А пасланцы ж былі з фарысеяў. І яны спыталіся ў яго: Тады чаму ты хрысціш, калі ты ні Хрыстус, ні Ілля, і ні прарок?

Ян сказаў ім у адказ: Я хрышчу вадою. А сярод вас стаіць той, каго вы не ведаеце, той, хто ідзе за мною, якому я не варты развязаць раменьчык на сандалях ягоных.

Было гэта ў Бэтаніі, за Ярданам, дзе хрысціў Ян.

*Гэта слова Пана.*

**Душа ўзвесяліцца ў Богу маім.**

**Дапамажы Яну Хрысціцелю дабрацца да Пана Езуса.**

